Месцічы

## Будуць працоўныя месцы — будуць жыць Целяханы

**Целяханы ў Івацэвіцкім раёне — самабытны край. У ваколіцах пасёлка залягаюць спрадвечныя балоты. Унікальныя прыродныя ландшафты могуць быць ледзьве не турысцкай Мекай. Па праграме развіцця малых гарадоў тут запланавана будаўніцтва ў 2006—2010 гадах так званай турысцка-рэкрэацыйнай зоны, якая ўмесціць у сябе турбазы ўздоўж Агінскага канала. На тэрыторыі пасёлка працуюць два асноўныя прамысловыя прадпрыемствы: РУЛП «Целяханы», якое ўсе ведаюць як лыжную фабрыку, і Целяханскі завод сталярных вырабаў. Першаму вытворцы так і не ўдалося пакуль пераадолець крызіс і выйсці на зададзеныя магутнасці, а другое паспяхова развіваецца.**

Заводу амаль паўстагоддзя. Апошнія дзесяцігоддзі таксама былі не лепшымі ў гісторыі прадпрыемства. Але цяпер усё наладжваецца. Нядаўна запусцілі цэх, які доўгія гады быў па сутнасці законсерваваны. Адразу з'явілася 21 новае рабочае месца. А зараз з канвеера сыходзяць еўравокны са шклопакетамі з клеенага бруса. Завод праходзіць рэканструкцыю. Тут устаноўлена найноўшае кацельнае, сушыльнае абсталяванне, станочны парк нямецкай і італьянскай вытворчасці. Сёлета за 10 месяцаў аб'ём вытворчасці вырас амаль на трэць у параўнанні з мінулагоднім. Галоўны спажывец Целяханскага завода — прадпрыемствы аблсельбуда, у структуры якога 60 будаўнічых арганізацый. І драўляныя вокны са шклопакетамі зараз вельмі запатрабаваныя. Ёсць вытворчая база, ёсць попыт на прадукцыю, значыць будзе жыць прадпрыемства, будуць утварацца новыя рабочыя месцы. Гэта самае важнае сёння для пасёлкаў, падобных Целяханам.

Прыватны бізнэс тут укараняецца марудна, нібы баязліва. Хоць ёсць яго першыя ластаўкі і тут. Святлана Стральчук адкрыла сваё кафэ-бар і не прагадала. Хоць скептыкі прарочылі поўны правал, маўляў, хто будзе хадзіць у такую ўстанову ў нашай палескай глухамані. Аўтару гэтых радкоў давялося зазірнуць у бар летам падчас камандзіроўкі. Вельмі прыемным падаўся інтэр'ер, гэткае спалучэнне народнасці і мадэрну. Але зроблена ненавязліва і з густам. Месцічы ацанілі і кухню новага шынка. На адсутнасць наведвальнікаў работнікі не скардзяцца. На навагоднія вечарыны запісваліся за паўтара месяца. З задавальненнем прыходзяць у кафэ і госці пасёлка, экскурсанты. А захавальнікам гісторыі тутэйшых мясцін можна без перабольшвання назваць Веніяміна Бычкоўскага.

Ён збірае легенды, паданні па крупінках. Стварыў музей сваімі рукамі. А зараз будуе капліцу ў вёсцы Бабровічы на месцы спаленых вёсак, там, дзе ўтварылася пустыня.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЗІМА КУПАЛАЎСКАГА ПАРКУ

Купалаўскі парк у цэнтры Мінска. У якім яшчэ горадзе знойдзеш такое, каб сярод аўтамабільнага тлуму і ззяння вітрын ты раптам трапляў бы на маленькую выспу, дзе заміж каменных гмахаў у высях абдымаюцца шаты старых дрэў, а гарадскую паліфанію перамагае цішыня.

Гэта зусім асобая цішыня — той стан, які трэба назваць перадумовай успамінаў і роздуму. Варта толькі нагадаць, што калісьці тут стаяла драўляная хата, дзе з 1927 па 1941 год жыў Янка Купала. Тут Пясняр ствараў, выношваў — пеставаў думкі і словы, па сёння такія блізкія кожнаму.

У першы дзень снежня парк быў заснежаным і бязлюдным. Белае покрыва хавала сляды пачатай сёлета рэканструкцыі і яднала алеі з берагам Свіслачы, якая пачала замярзаць.





Фота слова Яўгена ПЯСЕЦКАГА

***

*Снежыць на купалавых алеях,*
*замятае чыйсьці даўні след —*
*з кожнаю сняжынкай снег святлее,*
*з кожнай рыфмаю святлей Сусвет.*
*Ад якіх краёў прынеслі хмары*
*ў падарунак снежны карагод —*
*стуль, дзе гор паўднёвыя абшары,*
*ці з паўночных ўсцюжаных шырот?*

***

*Некалі такім жа снегападам*
*пакідаў Пясняр свой белы край,*
*і старыя яблыні ля хаты*
*шархацелі ўслед: даруй... бывай...*
*Парк купалаўскі ля рэчкі Свіслач,*
*дрэў старых маўклівыя шыхты —*
*колькі нас прайшло тут —*
*хто падлічыць,*
*каб пачуць мінулыя гады?*
*Каб пачуць, як павяртае рэха*
*галасы дзядоў і пошум дрэў,*
*і званы, што ў высях*
*б'юць адвеку,*
*і пад снегам вольнай рэчкі спеў.*

***

*Благаслаўляю першыя ільды —*
*іх светлы след над цьмянаю вадою*
*парозненыя лучыць берагі,*
*каб гэтай белай сцежкай*
*скрозь гады*
*прыйшла зіма убачыцца з вясною.*
*І я за ёй у снежны йду палон,*
*купалінку ў завеях дагукацца,*
*крануць яе касы духмяны лён...*
*і разумею: гэта толькі сон,*
*і ведаю: не варта прачынацца.*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.08 | 15.50 | 7.42 |
| Віцебск — | 8.05 | 15.33 | 7.28 |
| Магілёў — | 7.59 | 15.41 | 7.42 |
| Гомель — | 7.47 | 15.45 | 7.58 |
| Гродна — | 8.22 | 16.07 | 7.45 |
| Брэст — | 8.15 | 16.15 | 8.00 |

### Месяц

*Апошняя квадра 1 снежня. Месяц у сузор'і Шаляў.*

### Імяніны

*Пр. УВОДЗІНЫ (УВЯДЗЕННЕ Ў ХРАМ БОЖАЙ МАЦІ);*
*К. Барбары, Хрысціны, Бярнарда, Яна.*

## НАДВОР'Е на заўтра




— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні

| 2 гадз. | 5 гадз. | 8 гадз. | 11 гадз. | 14 гадз. | 17 гадз. | 20 гадз. | 23 гадз. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|

### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +4..+6°С | КІЕЎ +1..+3°С | РЫГА +3..+5°С |
| ВІЛЬНЮС +2..+4°С | МАСКВА -1..+1°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ 0..+2°С |

### НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў СНЕЖНІ

**5, серада** 1.00—5.00
**7, пятніца** 10.00—23.00
**8, субота** 0.00—6.00
**10, панядзелак** 14.30—18.00
**12, серада** 2.00—22.30
**13, чацвер** 0.00—4.00
**15, субота** 11.00—12.00
**19, серада** 18.30—20.30
**21, пятніца** 5.00—21.00
**23, нядзеля** 19.30—21.30
**25, аўторак** 12.00—23.00
**28, пятніца** 2.00—4.00

Пераможцы

## Алена БУНАС, чэмпіёнка свету: «БІЛЬЯРД — ГЭТА... ШАХМАТЫ НА СТАЛЕ»

**Упершыню ганаровае званне ў рускім більярдзе заваявала прадстаўніца Беларусі: у Кіеве мінчанка Алена Бунас стала чэмпіёнкай свету ў «пірамідзе». Пераможцу карэспандэнт «Звязды» знайшла, зразумела, у більярдным клубе. Спартсменка раней займалася тэнісам, а більярд быў для яе толькі прыемным бавленнем вольнага часу. Зараз жа ў калекцыі яе ўзнагарод ёсць медалі рознай вартасці з чэмпіянатаў свету, з кантынентальнага ж першынства — усе, акрамя «золата».**

— Пасля перамогі на чэмпіянаце свету ў мяне за паўдня разраджаецца тэлефон ад званкоў і паведамленняў, — прызнаецца Алена. — Мяне віншуюць не толькі беларусы, але і спартсменкі з Расіі, Украіны. Вельмі прыемна, што мяне памятае былая саперніца Ксенія Кіслова, якая ўжо не выступае. З ёй у нас заўжды была цікавая, напружаная гульня.

***— Раней вам не ўдавалася стаць наймацнейшай у свеце. Чым растлумачыце сёлетнюю перамогу?***

— Магу сказаць, што 80 працэнтаў поспеху — гэта працаздольнасць. Здаралася, я настолькі доўга трэніравалася, што не было сілаў пайсці з клуба. Я хацела б выказаць падзяку свайму трэнеру Аляксандру Жылкіну і галоўнаму трэнеру беларускай зборнай Юрыю Лобачу, які правёў перад чэмпіянатам збор більярдыстаў. На ім у мяне быў добры спарынг.

***— Нейкі час у вас быў статус заўжды другой на спаборніцтвах...***

— Паўгода таму расійскія журналісты мяне спыталі, чаму я заўжды станаўлюся другой. Я тады адказала, што другія месцы ў мяне былі толькі ў 2006-м, а ў 2005-м — у асноўным трэція. З такім ростам вынікаў я спадзявалася заваяваць «золата» ў 2007-м, што і адбылося.

***— Вы наймацнейшая не толькі ў свеце, але і ў Беларусі. Наогул, не адчуваеце канкурэнцыі з боку нашых спартсменак?***

— У Беларусі я ўжо дзесяціразовая чэмпіёнка. Першынство краіны сярод жанчын для мяне — падрыхтоўка да чарговага «Еўратура» ці адбор на міжнародныя спаборніцтвы. Я імкнуся ўдзельнічаць і ў мужчынскіх турнірах, нават перамагла былога чэмпіёна Беларусі. Дарэчы, змешаных турніраў у свеце, наколькі ведаю, больш няма. У нас спецыяльна дазваляюць жанчынам гуляць у мужчынскіх чэмпіянатах Беларусі для больш добрай падрыхтоўкі.

***— Чым, па-вашаму, адрозніваюцца жаночы і мужчынскі більярд?***

— Магу з упэўненасцю сказаць: мужчыны не паводзяць сябе спакайней за жанчын. Бачыла моманты, калі ігракі высокага ўзроўню памыляліся на прымітыўных шарах. Бясспрэчна, мужчыны больш вынослівыя, іх рухі больш тэхнічныя, але яны гуляюць згодна з логікай, і іх рашэнні можна прадугадаць. Жанчыны ж спадзяюцца на інтуіцыю: выбіраючы, здавалася б, няправільнае рашэнне, яно часта прыводзіць да поспеху.

***— Раскажыце аб сваім «залатым» кії...***

— У мяне кій майстра Каюкова. Ён складаецца з дзвюх частак, а зроблены з палісандра і грабу. Былы кій, з якім я доўга звыкалася, я адклала ўбок, бо гэты кій мне спадабаўся з першага ўдару. Ён адпавядае ўсім маім патрабаванням. Ім я гуляю ўжо год.

***— У вас ёсць нейкія рытуалы ў дзень спаборніцтваў?***

— Я не веру ў забабоны. Адзінае, што я раблю, — не даю свой кій у чужыя рукі, бо элементарна мне могуць сапсаваць наклейку, ды і да сваіх рэчаў я стаўлюся вельмі рэўнасна.

***— Як вы растлумачыце, што пакуль не маеце тытула чэмпіёнкі Еўропы, хоць ужо сталі самай моцнай у свеце?***

— На Еўропе я гуляла добра. Заўжды мяне лічаць адной з фаварытак. Аднак у фінале ў мяне была моцная саперніца. Дзесьці я недапрацавала. Буду больш трэніравацца.

***— Калі нехта з наведвальнікаў клуба прапануе згуляць, згодзіцеся?***

— Я ніколі нікому не адмаўляю, калі ў мяне ёсць на гэта час. Калі просяць, вяду ўрокі. Таксама ўжо тры месяцы выкладаю ва ўніверсітэце фізкультуры, але застаецца недастаткова часу для маіх трэніровак, таму, магчыма, спыню сваю выкладчыцкую працу, бо сумяшчаць некалькі спраў фізічна цяжка.

***— Калі б вам прапанавалі прадставіць свой від спорту, каб яго ўключылі ў алімпійскую сям'ю, якія б аргументы прывялі для гэтага?***

— Більярд вельмі відовішчны. Гэта не пустыя словы. Ён даступны для вялікай масы насельніцтва. Памятаю, як на п'едэстале разам сталі 19-гадовы юнак і 45-гадовы мужчына. Значыць, гуляць на добрым, высокім узроўні можна вельмі доўга. Праўда, у нашай краіне більярд значна памаладзеў.

***— А яшчэ більярд не надта траўманебяспечны.***

— Так. Траўму тут атрымаць цяжка. Здараюцца няшчасныя выпадкі толькі калі чалавек яшчэ не надта знаёмы з більярдам: абапіраецца на стол ці апускае руку ў лузу і, зразумела, так можна раздрабіць шарам пальцы. У яго ж вялікая хуткасць. Акрамя таго, стамляешся ў більярдзе ў асноўным псіхалагічна, бо патрэбна весці пазіцыйную гульню, ведаючы моцныя і слабыя бакі свайго саперніка.



Фота Вольгі ЛАСКІ.

***— Як ставіцеся да гульні на камп'ютары?***

— Гэта поўны прымітыў! Калі выйграць у гульні на камп'ютары, у жыцці такіх вынікаў не пакажаш. Адзінае, што можна, — вывучыць правілы і тое, калі яны аднолены, а больш карысці ніякай. У сапраўдным більярдзе важна тэхніка — правільная стойка, вокамер, канцэнтрацыя ўвагі, вытрымка. Гэта спецыфічныя шматгранны від спорту: акрамя таго, што гэта гульня двух сапернікаў, гэта яшчэ і спаборніцтвы з самім сабой. Па псіхалогіі більярд можна параўнаць са стральбой. Ужо даўно яго называюць і шахматамі на стале.

***— Якія ў вас любімыя більярдныя клубы?***

— Раней мне вельмі падабаўся клуб «Вена» на вуліцы Веры Харужай, але ён зачыніўся. Зараз я трэніруюся ў «Класіках» (іх тры) і ў «Пірамідзе».

***— Сваім хатнім жывёлам вы далі більярдныя мянушкі?***

— Не! Ката завуць Барсік, а сабаку — Малы, хоць у 8 месяцаў ён важыць ужо больш як 30 кг і яшчэ паправіцца. Аднак, паводле пашпарта, яго завуць Майстар Танга. Дарэчы, першы час кот вельмі крыўдзіў Малога. Ён нават пужаўся заходзіць у пакой. Дома ў нас для Барсіка і зараз толькі адзін аўтарытэт — тата.

***— Чым падабаецца займацца ў вольны час?***

— Звычайна я чытаю. Падабаюцца дэтэктывы (іх чытаю ў цягніках) і гістарычная літаратура. Калісьці зачытвалася Дастаеўскім, Тэкерэем, Сянкевічам.

***— На што вы патраціце свой выйгрыш?***

— Я хачу новую машыну. Магчыма, грошы пойдуць на добры адпачынак.

***— Дзякуй за гутарку! Жадаю папоўніць сваю калекцыю еўрапейскім «золатам».***

**Ірына ПРЫМАК.**

## 4 снежня

Дзве даты

**1680 год** — курыца ў Рыме знесла яйка, на шкарлупінні якога яскрава бачылася выява каметы, што з'явілася ў небе праз некалькі дзён.



**1939 год** — створаны першыя калгасы на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Цытата дня:

*«Хто дужы целам, той можа вытрываць і спякоту, і холад. Гэтак жа і той, хто здаровы душэўна, у стане перанесці і гнеў, і бяду, і радасць, і астатнія пачуцці».*

Эпіктэт (каля 50 — каля 140), старажытнарымскі філосаф-стоік.

Усміхнёмся!

## ФРАЗЫ ФУТБОЛЬНЫХ КАМЕНТАТАРАЎ

Шаўкоўскі атрымлівае пас ад свайго сябра па жыцці — Уладзіслава Вашчука. Дарэчы, яны жанатыя.

☺

Даўганогі Англама дастае мяч, які знаходзіўся за тры метры ад яго.

☺

**Траўму аказваюць іграку, які ляжыць на газоне.**

☺

Трэнер вельмі актыўна паводзіць сябе каля броўкі поля: крычыць, жэстыкулюе, п'е, а часам і курыць...

☺

**Чугайнаў аддаў пас, таму што пачуў грукат капыт абаронцы саперніка, які бег ззаду.**

☺

Сонца пазалаціла лысую галаву варатара.

☺

**Гэты світэр у яго — шчаслівы! Ён яго пятнаццаць гадоў носіць і не здымае!**




## «ІнтэрСтыль 2007»: прыгажосць і здароўе

Чатыры дні ў Мінску праходзіла VI Міжнародная спецыялізаваная выстава індустрыі прыгажосці і здароўя «ІнтэрСтыль 2007». Тут можна было не толькі паглядзець на навінкі, але і паўдзельнічаць у майстар-класах і конкурсах. У рамках «ІнтэрСтылю» адбыўся Фестываль па цырульніцкаму майстэрству, дэкаратыўнай касметыцы і нэйл-дызайну «Ружа вятроў».

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**







**Суд Аршанскага раёна і горада Оршы** ў сувязі са зваротам Шынгірэй В.А. аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак, вышуквае **ШЫНГІРЭЯ Аляксандра Мікалаевіча**, 24 сакавіка 1963 года нараджэння, ураджэнца горада Оршы Віцебскай вобласці, які пражываў у горадзе Оршы Віцебскай вобласці па вул. Міру, д. 61, кв. 134. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Шынгірэя А.М., паведаміць іх суду Аршанскага раёна і горада Оршы Віцебскай вобласці на працягу двух месяцаў з моманту апублікавання аб'явы.

**У суд Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці** паступіла заява аб прызнанні памерлым грамадзяніна **ХАМУКА Сяргея Пятровіча**, 1935 года нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства — в. Легаты Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці, які ў 1957 годзе пайшоў з дому, і болей звестак аб ім не паступала. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Хамука Сяргея Пятровіча, паведаміць іх суду Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **ЗАХАРА Сяргея Уладзіслававіча,** 17 студзеня 1973 года нараджэння, ураджэнца вёскі Салонікі Лепельскага раёна Віцебскай вобласці, які пражываў да верасня 2005 года ў вёсцы Лаздуны Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Захара С.У., паведаміць іх суду Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Нашу дарагую і любую **Лідзію Альфрэдаўну КЕЗАВУ**, сардэчна віншуем з 45-годдзем. Жадаем моцнага здароўя на доўгія гады, шчасця і дабрабыту, поспеху ў справах.

**Мама, брат, в. Залессе.**

Сардэчна віншую з днём нараджэння **Анатоля Пятровіча РУДКОЎСКАГА** з в. Дараганава Асіповіцкага раёна.

*Там, дзе цябе не ведае ваколле*
*І дзе над Пціччу не спявае салавей,*
*Ты прыгарні да сэрца нашае ўлонне,*
*І ад сяброў па вёсцы стане хай цяплей.*
Вітанне, дружа! Сто гадоў жыцця!

**Віктар ХУРСІК.**

КІРМАШ штотыднёвы рэкламны выпуск № 35 (568)

аддзел рэкламы ☎ 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПРАДАЕЦЦА

■ Катэдж у вёсцы, 40 км ад г. Ліды, ёсць сад, агарод, газ, вада, недалёка р. Нёман.
Тэл. 889 95 10.

■ Дом драўляны пад знос у Нясвіжскім раёне.
Тэл.: 8 029 170 10 31, 8 029 135 79 31.

■ Пакой, кухня агульная.
Тэл. 8 029 760 37 98.

■ Кватэра 3-пакаёвая кааператыўная (балкон, тэлефон, гараж) у райцэнтры Гарадок, нядорага.
Тэл.: 8 0212 48 08 09, 8 029 216 17 09.

■ Супер-млын 4 кВт, 2000 кг/гадзіну.
Тэл. 8 029 709 12 87.

■ Козы высокаўдойныя (5—6 л малака) 8-месячныя козачкі і пляменныя козлікі.
Тэл.: 8 02234 35 646, 8 029 841 53 53.

■ Воз на «гумавым хаду» паўтарашны, вельмі добры, усё новае.
Тэл. 8 01633 45 359.

■ Свіння вагой 150 кг, 5 тыс. рублёў за 1 кг.
Тэл. 8 01718 42 445.

■ «Опель-амега А» 1989 г.в., 2,0і, люк, магнітола, чорны, у добрым стане, 1500 у.а.
Тэл. 8 029 389 14 88.

■ Матацыкл «Усход» 1992 г.в., цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 01633 45 359.

■ ГАЗ-21 «с» «Волга» 1967 г.в.
Тэл.: 8 017 249 05 45, 8 029 689 05 45.

■ «Опель-вектра» 1998 г.в., 1,8б, серабрысты металік.
Тэл. 8 029 552 67 10.

■ Да ГАЗ-51, -53 тармазная сістэма новая ў зборы, кола з дыскам 220, гума і іншае.
Тэл. 801633 45 359.

### КУПЛЮ

■ Дом.
Тэл. 8 029 778 33 38.

■ Памяшканне пад вытворчасць, магазін, офіс, склад.
Тэл. 8 029 682 14 42.

■ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 029 655 07 16.

■ Трактар, запчасткі да яго — каленвал, ГБЦ, ТНВД, блок, шасцерні, валы і іншыя.
Тэл. 8 10380 688 44 68 89.

Шукаю працу вартаўніка ў раёне «Камароўкі».
Тэл. у Мінску 334 63 02.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287 17 79.

Пашпарт серыя__________ № __________ Выданы__________

Подпіс__________ Дата__________

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.132. Індэкс 63850. Зак. № 6595. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12